Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў

ФАРПОСТ СПАКОЮ

№ 8 (26)

ЗВЯЗДА 30 ліпеня 2016 г.



# ЗАБІ Ў САБЕ РАБА



**Здавалася б, жывём у час, калі кожны ўсё ведае пра асабістую бяспеку, а інфармацыя пра яе гучыць з кожнай радыёкропкі, прапісана на тысячах сайтаў. Аднак людзі працягваюць рабіць памылкі, трапляюць у пасткі і ператвараюцца ў рабоў без грамадзянскіх правоў, дакументаў. Паводле інфармацыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у 2012 годзе ахвярамі гандлю людзьмі сталі выхадцы з 154 краін. На жаль, і Беларусь не з'яўляецца выключэннем з правілаў...**

## «Гандаль людзьмі існуе па ўсім свеце»

— Гандаль людзьмі — гэта з'ява, якая існуе ў кожнай краіне, — падчас адмысловай прэс-канферэнцыі заўважыў **Зэйнал ГАДЖЫЕЎ, кіраўнік прадстаўніцтва Міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў Беларусі.** — Па ацэнках экспертаў сёння ў свеце налічваецца 21 мільён яго ахвяр. І не выпадкова барацьба з гэтай з'явай адлюстравана ў некалькіх дакументах ААН па ўстойлівым развіцці да 2030 года.

— 21 мільён — гэта крыху меней, чым насельніцтва ўсяго аўстралійскага кантынента, гэта ў два разы больш насельніцтва Беларусі, — дадае **Кацярына ПАНІКЛАВА, намеснік пастаяннага прадстаўніка праграмы развіцця ААН у Беларусі.** — Вось з такімі маштабамі мы сёння маем справу. Самы распаўсюджаны спосаб трафікінга — сексуальнае рабства. Ахвярамі становяцца пераважна жанчыны і дзяўчынкі. Другой па значнасці формай рабства з'яўляецца прымусовая праца, адна з самых згубных з'яў для чалавека. Гэта від дзейнасці, што цалкам знішчае свабоду выбару, жыцця і перамяшчэння.

За апошнія сямнаццаць гадоў беларускія праваахоўныя органы дасягнулі пазітыўнай дынамікі ў гэтым пытанні. Як падкрэсліў **Андрэй САЛАДОЎНІКАЎ, выконваючы абавязкі начальніка галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі МУС Беларусі,** міліцыя стараецца працаваць на папярэджанне злачынстваў, звязаных з эксплуатацыяй чалавека, педафіліяй, распаўсюджваннем парнаграфіі. Калі верыць статыстыцы, найбольшую колькасць здарэнняў па артыкуле «Гандаль людзьмі» выявілі ў 2005 годзе — 159 фактаў. За апошнія пяць гадоў штогод выяўляюцца не больш 10 падобных злачынстваў. Нягледзячы на гэта, людзі ўсё роўна трапляюць у пастку сучасных гандляроў «жывым таварам». Беларусы сярод такіх няшчасных не рэдкасць. З 2002 года з 5298 ахвяр гандлю людзьмі сексуальнай эксплуатацыі падвергліся 4693 чалавекі.

## Сумная геаграфія

Наша краіна найчасцей з'яўляецца радзімай такіх ахвяр. Некаторых жанчын адразу падманваюць, прапануючы добрыя ўмовы працы, а іншыя загадзя ведаюць, чым будуць займацца. Толькі яны не вераць у тое, што застануцца за мяжой без аніякіх правоў. Як лічыць **Уладзімір ЕМЯЛЬЯНАЎ, намеснік начальніка другога ўпраўлення галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі МУС,** афіцыянтка, пакаёўка, прыбіральшчыца — гэта часцяком не патэнцыйная прафесія, а прыхаваны метад вярбоўкі ахвяры.

— Трафікёры на месцы не сядзяць, — кажа суразмоўца. — І калі раней было запатрабавана знаходзіць ахвяр падманам, цяпер дзейнічаюць інакш. Яны загадзя знаходзяць патрэбных ім жанчын і наўпрост кажуць, што яна будзе працаваць прастытуткай. Ёй абяцаюць добры заробак, але калі дзяўчына прыязджае на месца «працы», усведамляе, што ўсё зусім не так, як ёй абяцалі. Яна трапляе ў краіну з іншай культурай, незнаёмай мовай і становіцца залежнай ад свайго вярбоўшчыка, выконвае яго волю.




Для сексуальнай працы трафікёры найчасцей перапраўляюць беларусак у Турцыю, Расію, краіны Еўрасаюза. За першае паўгоддзе МУС перакрыла 12 каналаў вывазу людзей у 5 краін свету: у Расію — 5, Турцыю — 4, Аўстралію, Кіпр, Кітай — па адным.

Што цікава, Беларусь таксама выкарыстоўваюць як пункт дастаўкі «жывога тавару». З 2006 года да нас для рабскай працы накіроўвалі грамадзян В'етнама, Расіі, Украіны і Малдовы.

Каб пазбегнуць адказнасці, самі трафікёры стараюцца не прыязджаць да нас, шукаюць людзей праз інтэрнэт, сустракаюць іх ужо ў краіне прызначэння. Хоць самыя адважныя рабілі інакш, на чым і пагарэлі. У МУС расказалі, што асобныя замежнікі выкарыстоўваюць беларускія крымінальныя сувязі, каб наладзіць вярбоўку жанчын для прастытуцыі. Пры такіх сітуацыях міліцыя стараецца прадухіліць выезд жанчын за мяжу. Толькі за гэты год праведзена чатыры аперацыі па затрыманні трафікёраў, арыштавалі восем чалавек. Чатыры аказаліся жыхарамі Расіі, адзін — грамадзянін Германіі. Беларусаў у гэтай невясёлай кампаніі — трое. Адзін з трафікёраў — жанчына, якая стварыла нават спецыяльны сайт і падбірала прастытутак у Беларусі для далейшай работы ў Турцыі. Жахлівы бізнес аказаўся для яе даволі прыбытковым. Пра ўсё скажуць лічбы. Пры вышуку праваахоўнікі выявілі ў яе больш за 360 тысяч долараў...

## Секс-турызм — новыя выклікі для міліцыі

Калі бачыш па тэлебачанні сюжэт пра інтымны турызм, адразу прыгадваеш экзатычныя краіны, куды дзеля яго адпраўляюцца натоўпы заклапочаных турыстаў. Беларусь — краіна не экзатычная, аднак і гэты від адпачынку дабраўся да нашых ваколіц. У размове з карэспандэнтам «Звязды» Уладзімір Емяльянаў сказаў, што падобныя выпадкі хоць і нешматлікія, але ўсё роўна фіксуюцца на працягу апошняга дзесяцігоддзя.

— Такая з'ява характэрна пераважна для сталіцы, — кажа суразмоўца. — Усё ж такі гэта абумоўлена тым, што ў Мінску шмат казіно, начных клубаў, другіх забаўляльных устаноў... Адзін грамадзянін Турцыі арганізаваў цэлую сетку здымных кватэр, у якіх нашы дзяўчаты працавалі прастытуткамі. Мэтай прыезду туркаў, якіх ён запрашаў, значылася азнаямленне з выдатнымі мясцінамі Беларусі. Праўда, цікавілі іх выключна інтымныя ўцехі. Праз некаторы час на гэтым папаўся яшчэ адзін турак. Наша заканадаўства дазваляе плённа працаваць у гэтым кірунку і прыцягваць вінаватых да адказнасці. Спадзяёмся, тыя людзі, якія патрапілі пад яе, здолеюць данесці сваім суайчыннікам, што такім бізнесам займацца ў нашай краіне не трэба.

**Тарас ШЧЫРЫ**

■ Прыклад іншым

# ЗАЎЖДЫ НА СЛУЖБЕ

**Супрацоўнік Дэпартамента аховы абяззброіў хулігана... вяртаючыся з крамы**

У апошні дзень перад водпускам **інспектар аховы спецыяльнага батальёна міліцыі ўпраўлення Дэпартамента аховы па ахове дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў Дзмітрый ЖАРТУН** вяртаўся дадому з магазіна — вырашыў пачаставаць блізкіх тортам з нагоды надыходзячага адпачынку. Раптам мужчына заўважыў у адным з аўтастаянак маладых людзей: у аднаго ў руках быў нож, у іншага — рэзаная рана на твары. Апрануты ў грамадзянскае афіцэр прадставіўся супрацоўнікам міліцыі. Пакуль пацярпелы расказваў пра інцыдэнт, мужчына з нажом паспрабаваў уцячы праз бліжэйшыя дворы. Дзмітрый Жартун кінуўся за ім.



«Калі я дагнаў зламысніка, у яго руках убачыў баявы нож-кастэт і зразумеў, што проста выбіць з рук зброю не атрымаецца, — расказвае інспектар аховы. — Ацаніўшы становішча і праціўніка, вырашыў псіхалагічна націснуць, папросту прыпужаць яго. Балазе, вагавыя ды і ўзроставыя катэгорыі ў нас розныя. Я некалькі разоў досыць груба крыкнуў на яго: «Стаяць, не рухацца, я супрацоўнік міліцыі, кідай зброю!» Ён сапраўды спалохаўся, у той жа момант спыніўся, адкінуў у бок нож, прысеў на кукішкі і прамовіў: «Гульня скончана...»

Дарэчы, гульня для нападніка сапраўды скончана. На мінчаніна 1988 года нараджэння заведзена крымінальная справа па артыкуле «Хуліганства» Крымінальнага кодэкса. Як паведамляюць у прэс-службе Дэпартамента аховы Міністэрства ўнутраных спраў, затрыманы быў у стане алкагольнага ап'янення. Мужчына спецыяльна шукаў канфлікту: ішоў праз стаянку і штурхаў прахожых. Адзін з іх зрабіў яму заўвагу, у адказ на што атрымаў удар нажом у скулу. За затрыманне п'янага дэбашыра міліцыянер быў прэміраваны і ўзнагароджаны нагрудным знакам «За адзнаку».

«Кожны б так зрабіў на маім месцы, — кажа лейтэнант міліцыі. — Я доўгі час працаваў у групе затрымання, у нас такіх выпадкаў магло быць некалькі ў дзень. Менавіта дзякуючы гэтаму вопыту я лёгка заўважаю псіхалагічныя асаблівасці парушальнікаў і дзейнічаю па абставінах, імкнучыся лішні раз словам і сілай пераканаць абразумець зламысніка».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

# Пастраляў з пнеўматыкі і атрымаў тэрмін за «хуліганку»

**Кожны мужчына, напэўна, памятае, як у дзяцінстве з непрыхаваным інтарэсам заходзіў у цір і пасля страляў па металічных фігурках з пнеўматычнага ружжа. Нехта з-за настальгіі робіць гэта і зараз. Але наўрад ці можа ўявіць сабе тое, што з дапамогай пнеўматыкі хтосьці будзе наўмысна прычыняць шкоду іншаму чалавеку альбо чужой маёмасці.**

Але, на жаль, гэта наша рэчаіснасць, у якой хапае месца ўсяму. Вось некалькі свежых прыкладаў. У красавіку жыхар Заводскага раёна сталіцы пастраляў з пнеўматыкі... па пластыкавых вокнах суседкі. Ды зрабіў гэта так «удала», што патрапіў пад адказнасць па артыкуле «Хуліганства». А напачатку ліпеня па інтэрнэце распаўсюдзілася яшчэ больш непрыемная навіна. Жыхар вядомых на ўсю Беларусь сваімі агуркамі Альшанаў, што на Століншчыне, пацэліў з пнеўматычнага пісталета шасцігадоваму хлопчыку ў шыю. На шчасце, усё абышлося, малому нават не спатрэбілася шпіталізацыя, але ўсё магло скончыцца жахліва. Следчы камітэт крымінальную справу ў дачыненні стралка ўсё ж такі завёў. Падобныя злачынствы выклікалі ў нас цэлы шэраг пытанняў. З імі мы і накіраваліся да **Андрыяна КАХНОВІЧА, начальніка аддзела ліцэнзійна-дазвольнай работы ўпраўлення прафілактыкі МУС.**

— Уся пнеўматыка дзеліцца на дзве вялікія групы — пнеўматычную зброю і вырабы, якія канструктыўна падобныя да яе, — пачынае размову Андрыян Мікалаевіч. — Пнеўматычныя вырабы з дульнай энергіяй да 3 джоўляў зброяй не лічацца і знаходзяцца ў свабодным продажы. Так прынята не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах. А вось зброю з энергіяй звыш 3 джоўляў можна прадаваць выключна па спецыяльным дазволе. На ўтрыманне пнеўматычнай зброі, якая перавышае 7,5 джоўля, ужо трэба мець дазвол органаў унутраных спраў.

**Ёсць пералік хвароб і фізічных недахопаў, якія забараняе валодаць зброяй: псіхічныя растройствы, нервовыя і хірургічныя захворванні, хваробы вачэй, горла, слыху.**

З той пнеўматычнай зброяй, якая знаходзіцца ў нас на ўліку, праблем амаль не бывае. Яна пад кантролем, пастаянна правяраецца. Аднак з канструктыўнымі вырабаў усё ж такі пастрэльваюць. І каб папярэдзіць злачынствы, МУС летась выступіла з ініцыятывай абмяжоўваць продаж пнеўматычнай непаўналетнім. Зварот ужо знаходзіцца на разглядзе ў Савеце Міністраў.

**— Каб захоўваць пнеўматыку звыш 7,5 джоўляў у сваёй кватэры, ці трэба атрымаць даведку ад урача?**

— Безумоўна. Ёсць пералік хвароб і фізічных недахопаў, якія забараняе валодаць зброяй. Сярод іх псіхічныя растройствы, нервовыя і хірургічныя захворванні, хваробы вачэй, горла, слыху.



**— Якімі яшчэ трэба валодаць дакументамі, каб мець пнеўматычную зброю?**

— Членскі білет спартыўнай арганізацыі, у якім прапісана, што вы займаецеся стральбой ужо больш за 5 гадоў, альбо пасведчанне паляўнічага. І, безумоўна, вы мусіце мець жалезную шафу, дзе будзеце захоўваць зброю.

**— Якая адказнасць прадугледжана за незаконны збыт пнеўматыкі?**

— Штраф ці выпраўленчыя работы на тэрмін ад аднаго да двух гадоў. Альбо пазбаўленне волі да двух гадоў, арышт да шасці месяцаў. Пнеўматыку і канструктыўна падобныя вырабы абавязкова трэба прадаваць па ліцэнзіі. Усе яна павінна прайсці сертыфікацыю ў Дзяржаўным экспертна-крыміналістычным цэнтры. У іншым выпадку прадаўцы панясуць адказнасць. Так, сёлета з незаконнага абарачэння выведзена 79 адзінак пнеўматычнай зброі. За незаконны збыт заведзены 4 крымінальныя справы.

Трэба заўжды памятаць, што пнеўматыка не з'яўляецца сродкам самаабароны. Яе задача — удасканаленне вашых навыкаў у стральбе. Таму любая страляніна з яе ў грамадскіх месцах будзе расцэньвацца як хуліганства, а трапны выстрал можа прычыніць даволі сур'ёзныя цялесныя пашкоджанні. Нават страту зроку, слыху... Таму перад тым, як набыць такую небяспечную рэч, яшчэ раз падумайце, ці патрэбна яна вам насамрэч.

**Тарас ШЧЫРЫ.**